А. І. СМОЛІК

# ТЫШКЕВІЧАЗНАЎСТВА Ў БЕЛАРУСІ: ЗДАБЫТКІ І ПРАБЛЕМЫ / TIŠKEVIČIŲ TYRIMAI Į BALTARUSIJA: PASIEKIMAI IR IŠŠŪKIAI

A. SMOLIK

# THE STUDY OF TYSHKEVICHS' CULTURAL HERITAGE: ACHIEVEMENTS AND PROBLEMS

*The article analyzes the works of the Belarusian scientists who study the scientific, artistic, cultural and educational activities of Tyshkevichs. The author notes that the study of their heritage began in the XIX century. A. Kirkor, V. Karatynski in their scientific writings appreciated the archaeological and ethnographic works of Kanstantine and Yaustakhy Tyshkevichs. During the first half of the twentieth century the Tyshkevichs' artistic heritage was disregarded by the Soviet scientists and only in the second half of the century the intensive researches in this area began. The article analyzes the works of G. Baryshau, A.Gritskevich, D.Karau, G.Kakhanousky and other Belarusian scientists, dedicated to the study of Tyshkevichs' heritage. The author supposes that the study of Tyshkevichs' cultural heritage has been formed as a direction in the Belarusian science, which further development suggests cooperation with scientisits of Lithuania, Poland and Ukraine.*

З развіццём феадальнага грамадства Вялікага Княства Літоўскага ў яго сацыяльнай сістэме на працягу XV–XVI стст. адбываюцца пэўныя змены. З феадальнай знаці вылучаюцца магнаты, якія лічылі сябе нашчадкамі Рурыкавічаў, старадаўніх княжацкіх родаў, выхадцаў з татарскіх ханаў і замежнай тытулаванай знаці і на гэтай падставе атрымлівалі графскія тытулы. Так, у XVI ст. графскія тытулы Свяшчэннай Рымскай імперыі (карыстацца гэтым тытулам дазвалялася і ў ВКЛ) атрымалі Юрый Ільініч («на Міры»), Ян Хадкевіч («на Шклове, Мышы і Быхаве»), Васіль Тышкевіч («на Лагойску і Бярдычаве») і інш.

Прадстаўнікі роду Тышкевічаў мелі значныя зямельныя надзелы ў Ковенскай, Віленскай, Мінскай, Кіеўскай губернях. Напрыклад, ім належалі (у межах сучаснай Беларусі) маёнткі Валожын, Лагойск, Плешчаніцы, Свіслач. Але Тышкевічы нас цікавяць не толькі як уладальнікі вялікіх маяратаў. Беларуская графская лінія Тышкевічаў дала нашай краіне таксама славутых навукоўцаў, даследчыкаў матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народа, дзеячаў мастацтва. На сродкі ўладальнікаў маяратаў ўзведзены шэраг архітэктурных помнікаў, асобныя з іх захаваліся да нашага часу і прыстасаваны да ўжытку ў сацыяльнай дзейнасці. Прадстаўнікі беларускай лініі графскага роду Тышкевічаў пакінулі багатую дакументальную і літаратурную спадчыну, якая прадстаўлена навуковымі працамі і архіўнымі дакументамі [19, с. 82–83].

Звяртацца да навуковай спадчыны Тышкевічаў пачалі яшчэ ў XIX ст. Так, вядомы беларускі археолаг А. Г. Кіркор у артыкуле «Литовские древности» (1854) пісаў, што археалогія гэтага цікавага краю абавязана графу Яўстаху Піевічу Тышкевічу, што ён першы звярнуў увагу на гэты важны прадмет і паспеў зрабіць значна больш, чым сколькі можна было чакаць ад адной прыватнай асобы. Высокую ацэнку навуковай дзейнасці Яўстаха (1814–1873) і Канстанціна (1806–1868) Тышкевічаў даў у свой час і В. Каратынскі: пошукі Тышкевічаў, «праведзеныя ў тых магілах, узбагацілі Віленскі археалагічны музей і Лагойскія зборы надзвычай каштоўнымі ўзорамі каменных, бронзавых, жалезных і шкляных вырабаў» [13, с. 637] – і кожнаму з іх прысвяціў асобны артыкул [12, с. 115–121, 126–141]. Але на працягу амаль усяго савецкага перыяду творчыя здабыткі роду Тышкевічаў не даследаваліся беларускімі навукоўцамі па прычыне класавага падыходу да паходжання асобы. Тышкевічы лічыліся прадстаўнікамі эксплуататарскіх класаў польскага паходжання, таму што былі каталікамі, карысталіся польскай мовай і пэўны час жылі за межамі Беларусі. Напрыклад, у 1981 г. у БССР выйшаў падручнік для вышэйшых навучальных устаноў «Этнография Белоруссии». Яе аўтар, М. Піліпенка, узгадвае шэраг імён даследчыкаў матэрыяльнай культуры беларусаў, але абыходзіць маўчаннем этнаграфічную дзейнасць Тышкевічаў, хаця Канстанцін і Яўстах сабралі падчас экспедыцый па Беларусі, наладжаных на ўласныя сродкі, багацейшыя артэфакты народнай культуры і на іх аснове стварылі ў 1842 г. першы публічны музей у Лагойску. Па той жа прычыне, на наш погляд, не ўпамінаюцца імёны Тышкевічаў у калектыўнай манаграфіі «Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя» (1985). Але навуковая, культурна-асветніцкая дзейнасць Пія Тышкевіча (1756–1858), яго сыноў Канстанціна і Яўстаха была настолькі маштабная, тэарытычна і практычна значная, што ўжо ў 1970–80-х гг. пачынаюць з'яўляцца першыя навуковыя працы беларускіх даследчыкаў, дзе аналізуецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краязнаўчая, фалькларыстычная, этнаграфічная і музеязнаўчая дзейнасць Тышкевічаў. Так, у часопісе «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі» ў 1971 г. надрукаваны артыкул С. Акуліча, у якім разглядаецца дзейнасць братоў Тышкевічаў па стварэнні музея ў Лагойску і Музея старажытнасцей ў Вільні ў 1856 г. і высока ацэньваецца не толькі музеязнаўчая, але і археалагічная праца графаў
[1, с. 49–51].

Важкі ўнёсак у айчыннае тышкевічазнаўства зрабіў нястомны даследчык культуры беларускага народа Г. А. Каханоўскі. У сваёй манаграфіі «Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст.» (1984) ён грунтоўна прааналізаваў шматаспектную навуковую дзейнасць братоў Тышкевічаў [15]. Так, аўтар адзначаў, што Канстанцін Тышкевіч быў першым беларускім археолагам, які складаў тапаграфічныя планы замкаў і гарадзішчаў, вёў дзённікі археалагічных раскопак. Краязнаўчы аспект спадчыны Тышкевічаў асвятляецца Г. А. Каханоўскім у манаграфіі «Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч» (1992). Ім таксама змешчаны шэраг біяграфічных звестак пра род Тышкевічаў у розных энцыклапедыях і даведніках [16].

Пра тэатры Тышкевічаў у Плешчаніцах і Свіслачы ёсць звесткі ў працы Г. І. Барышава «Маёнткавыя прыгонныя тэатры на Беларусі» (1983). Мастацтвазнаўца лічыў гэтыя тэатры аматарскімі, артыстамі ў якіх былі сяляне і жыхары мястэчак. Адбываліся ў іх і прадстаўленні вучняў гімназіі, праезджых вольных труп Я. Шыманскага і віленскага тэатра М. Кажынскага [3].

Радавод Тышкевічаў дэталёва вывучаў А. Грыцкевіч. Каштоўныя звесткі аб 17 прадстаўніках роду ўтрымліваюцца ў артыкулах «Тышкевічы» (2001) [7] і «Радавод Тышкевічаў» (2009) [8]. Даследчык адзначыў, што графскі род меў дзве галіны: Скуміны-Тышкевічы (украінская) і Тышкевічы-Каляніцкія (беларуская). Гісторык сведчыў, што род Тышкевічаў не згубіўся ў цемры стагоддзяў, а працягвае існаваць і ў наш час у складзе інтэлігенцыі розных краін свету.

Значную ўвагу навуковай і грамадскай дзейнасці Канстанціна і Яўстаха Тышкевічаў удзяляе гродзенскі гісторыёграф Д. У. Караў у сваёй рабоце «Белорусская историография конца XVIII – нач. XX в.» (1993) [14]. Навуковец заўважае пра вялікую значнасць публікацый братоў, іх апісанняў даследаваных крывіцкіх курганоў і гарадзішчаў. Спецыфічныя адметнасці вывучэння Тышкевічамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

курганоў на тэрыторыі Лагойшчыны прасочвае А. В. Вайцяховіч і адзначае, што К. Тышкевічам былі сфармуляваны асноўныя правілы і задачы раскопак курганоў, якія не страцілі навуковай актуальнасці і сёння [5].

Беларускі музеязнаўца А. А. Гужалоўскі прысвяціў Віленскаму музею старажытнасцей асобную працу, дзе прасочвае працэс першай музеефікацыі матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага этнасу [9]. Вызначэнню месца і ролі Музея старажытнасцей у фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў прысвечаны артыкулы С. І. Жыгуновай [11] (2009) і І. Н. Колабавай (2009) [17]. Уплыў методыкі фарміравання музейнай экспазіцыі, распрацаванай К. Тышкевічам, на дзейнасць супрацоўнікаў сучасных рэгіянальных музеяў даследуе беларускі гісторык М. А. Бяспалая. Навуковец пераканаўча паказвае, што галоўныя музейныя прынцыпы, сфармуляваныя К. Тышкевічам, выразна праяўляюцца і складаюць стрыжань працэсу камплектавання фондаў сучасных музеяў [4].

Працэс станаўлення айчыннага тышкевічазнаўства разглядае А. А. Трусаў у артыкуле «Вяртанне навуковай спадчыны братоў Тышкевічаў у беларускую археалогію» (2009) [20]. Даследчык заўважае, што ў развіцці айчыннай галіны тышкевічаграфіі адыгралі ролю работы і расійскіх вучоных. У прыватнасці, А. Трусаў прыводзіць працы маскоўскага археолага Л. У. Аляксеева, дзе археалагічнай дзейнасці Тышкевічаў прысвечаны асобныя раздзелы [2].

Прадстаўнікі феадальнай знаці імкнуліся захаваць для нашчадкаў найважнейшыя падзеі з гісторыі сваіх радаводаў, што праяўлялася ў стварэнні і захаванні ў прыватнаўласніцкіх рэзідэнцыях архіваў і збораў старажытнасцей. Магнацкія архівы ўтрымлівалі гістарычныя дакументы: прывілеі на пасады і падараванне маёнткаў, дакументы гаспадарчага і адміністрацыйнага кіравання, паперы, якія змяшчалі генеалагічную інфармацыю, перапіску высокапастаўленых асоб, інвентары, граматы, фінансавыя дакументы, акты і г. д. У многіх з іх былі сабраны арыгіналы дакументаў вярхоўнай улады Кароны і ВКЛ. Сярод іх выдадзеныя ў розныя часы каралеўскія і вялікакняжацкія лісты, інструкцыі, жалаваныя і пацвярджальныя прывілеі на беларускія замкі, маёнткі, мястэчкі, гарады.

Беларускі архівазнаўца А. Я. Паўлава сцвярджае, што ў фамільным архіве Тышкевічаў захоўваліся таксама багатыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калекцыі дакументаў і прадметаў. Вядома, што яшчэ Аўгуста (маці Канстанціна і Яўстаха) распачала збор унікальных рукапісаў і дакументаў. А. Я. Паўлава лічыць, што адзінага комплексу архіўных дакументаў Тышкевічаў на тэрыторыі нашай дзяржавы не існуе [18]. Пераважная колькасць дакументаў гэтага роду знаходзіцца ў Дзяржаўным гістарычным архіве, бібліятэцы Акадэміі навук і Цэнтральнай бібліятэцы Літоўскай Рэспублікі.

Выяўленнем месца знаходжання тышкевіцкіх архіўных збораў займаўся Г. Я. Галенчанка. Паводле меркаванняў вучонага, пэўная частка архіва Тышкевічаў знаходзіцца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве, а таксама ў львоўскім і вроцлаўскім Асалінэуме [6].

Дзейнасць па даследаванні духоўнай спадчыны роду Тышкевічаў значна актывізавалася на пачатку XXI ст., калі навукоўцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў заснавалі Тышкевіцкія чытанні. На іх падводзяцца вынікі пошукавай, даследчыцкай дзейнасці не толькі масцітых вучоных, але аспірантаў і краязнаўцаў розных рэгіёнаў Беларусі. Ужо адбыліся чатыры такія чытанні, на якіх з навуковымі дакладамі выступілі больш як трыццаць прыхільнікаў навукова-асветніцкай дзейнасці прадстаўнікоў роду Тышкевічаў. У працэсе даследавання адкрыты новыя грані творчай, эканамічнай, палітычнай, грамадскай дзейнасці не толькі Пія, Канстанціна і Яўстаха, але і іншых нашчадкаў графскага роду.

Цікавую старонку ў гісторыю тышкевіцкага радаводу ўпісаў Тадэвуш Тышкевіч (1774–1852), які браў актыўны ўдзел у паўстаннях 1794 і 1830–31 гг., у руска-французскай вайне 1812 г., з’яўляўся сенатарам Каралеўства Польскага. Менавіта ён быў ініцыятарам будаўніцтва Свіслацкай гімназіі. Да гэтага навучальная ўстанова размяшчалася ў будынку, які падараваў Вікенцій Тышкевіч і ахвяраваў тысячу злотых на яго перабудову. Спробу паказаць шматгранную палітычную, ваенную і грамадскую дзейнасць Т. Тышкевіча зрабіў А. Ерашэвіч [10].

З роду Тышкевічаў паходзіць сучасная знакамітая польская кінаактрыса Беата Тышкевіч, якая здымалася ў многіх кінафільмах рэжысёраў А. Вайды, К. Занусі – «Samson» («Самсон»), «Popioty» («Попел»), «Wszystko na sprzedaż» («Усё на продаж»), «Kontrakt» («Кантракт»), «Dotknięcie ręki» («Дотык рукі») і інш. Актрысу запрашалі для выканання галоўных роляў таксама савецкія рэжысёры («Дворянское гнездо», «Европейская история»). Яна здымалася ў шматлікіх тэлесерыялах – «Welka milosc Balzaka»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(«Вялікая любоў Бальзака»), «Stawka wieksza niż życie» («Стаўка большая, чым жыццё»), «Sława i chwała» («Слава і хвала»), «Tredowata» («Пракажоная») і інш.). Была запрошана вядомым беларускім рэжысёрам М. Пташуком на фільм «В августе 44-го…». Беата Тышкевіч сапраўдная пераемніца слаўных традыцый графскага роду – жыць з годнасцю і карысцю, яна не спыняецца на схіле акцёрскай кар’еры, вядзе калонку ў часопісе, піша ўспаміны, захапляецца фатаграфіяй і выдае альбомы…

На заканчэнне, мяркуем, ёсць падстава адзначыць, што ў Беларусі назіраецца цікавасць навукоўцаў да даследавання шматаспектнай творчай спадчыны, створанай родам Тышкевічаў цягам амаль шасці стагоддзяў, і ў той жа час тое, што беларускімі аўтарамі яшчэ не апублікавана ні адна грунтоўная манаграфія, у якой бы сістэмна і комплексна разглядаліся кірункі дзейнасці прадстаўнікоў славутага графскага роду. Такі стан тлумачыцца шэрагам фактараў. Па-першае, архіўныя дакументы Тышкевічаў знаходзяцца за межамі Беларусі (Літва і Польшча) і візавая сітуацыя ўскладняе наведванне гэтых архіваў. Па-другое, Тышкевічы карысталіся польскай мовай і ўсе іх навуковыя працы («Вілія і яе берагі», «Апісанне Барысаўскага павета», «Пра курганы ў Літве і Заходняй Русі» і інш.) напісаны па-польску, што патрабуе дасканалага ведання польскай мовы. Па-трэцяе, польскімі даследчыкамі прааналізавана жыццё і разнастайная дзейнасць шэрагу прадстаўнікоў тышкевіцкага роду, якія ў манаграфічных і навукова-папулярных польскіх выданнях трактуюцца як польскія патрыёты і, безумоўна, прадстаўлены толькі ў кантэксце польскай гісторыі і культуры. Працы польскіх калег можна разглядаць як каштоўныя крыніцы, але патрабуюць сурьёзнай крытычнай інтэрпрэтацыі. Перакладаў на беларускую і рускую мовы вельмі мала, што таксама перашкаджае іх інтэрпрэтацыі беларускімі даследчыкамі.

Тышкевічы і іх шматгранная дзейнасць садзенічалі развіццю не толькі беларускай духоўнай і матэрыяльнай культуры. Яны пакінулі прыкметны след у гісторыі і культуры Літвы і Польшчы. Таму даследаванне іх спадчыны патрабуе аб’яднаных намаганняў вучоных суседніх краін. Пятыя Тышкевіцкія чытанні, якія ладзяцца ў Літве, на наш погляд, першая прыступка будучага сумеснага навуковага праекта беларусаў, літоўцаў і палякаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Акуліч, С.* Музеі братоў Тышкевічаў / С. Акуліч // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1971. – № 2. – С. 49–51.

2. *Алексеев, Л. В.* Археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев. – Минск : Белорус. наука, 1996. – 206 с.

3. *Барышаў, Г. І.* Маёнткавыя прыгонныя тэатры на тэрыторыі Беларусі / Г. І. Барышаў // Гісторыя беларускага тэатра : у 3 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – Т.1. Беларускі тэатр ад вытокаў да кастрычніка 1917 г. – С. 211–212.

4. *Бяспалая, М. А.* Сучасныя тэндэнцыі ў камплектаванні фондаў рэгіянальных музеяў як працяг традыцый Я. і К. Тышкевічаў / М. А. Бяспалая // Чацвёртыя Тышкевіцкія чытанні (г. Валожын, 24 кастр. 2012 г.) : матэрыялы чытанняў / рэдкал. : М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.] ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2012. – С. 5–16.

5. *Вайцяховіч, А. В.* Некаторыя аспекты вывучэння курганоў на тэрыторыі Лагойскага раёна / А. В. Вайцяховіч // Другія Тышкевіцкія чытанні (г. Лагойск, 15 кастр. 2009 г.) : матэрыялы чытанняў / рэдкал. : А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.] ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2009. – С. 12–19.

6. *Галенчанка, Г. Я.* Архівы Тышкевічаў / Г. Я. Галенчанка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. В. Біч [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – Т. 1. – С. 173.

7. *Грыцкевіч, А.* Тышкевічы / А. Грыцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2001. – Т. 6, кн. 1. – С. 551–552.

8. *Грыцкевіч, А.* Радавод Тышкевічаў / А. Грыцкевіч // Другія Тышкевіцкія чытанні (г. Лагойск, 15 кастр. 2009 г.) : матэрыялы чытанняў / рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд. ) [і інш.] ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2009. – С. 21–25.

9. *Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2001. – 109 с.

10. *Ерашэвіч, А.* Тышкевіч Тадэвуш / А. Ерашэвіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2001. – Т. 6, кн. 1. – С. 551.

11. *Жыгунова, С. І.* Віленскі музей старажытнасцей / С. І. Жыгунова // Другія Тышкевіцкія чытанні (г. Лагойск, 15 кастр. 2009 г.) : матэрыялы чытанняў / рэдкал. : А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.] ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2009. – С. 25–32.

12. *Каратынскі, В.* Творы: пер. з пол. / В. Каратынскі ; уклад. У. Мархеля. – Мінск : Мастац. літ., 1981. – 173 с.

13. *Каратынскі, В.* Карціны з берагоў Нёмана / В. Каратынскі // Літаратура Беларусі XIX стагоддзя : анталогія / уклад. К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антаневіч ; навук. рэд. А. І. Мальдзіс. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – С. 637–639.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. *Карев, Д. В.* Белорусская историография конца XVIII – нач. XX в. / Д. В. Карев // Наш радавод. – Гродна : [б. в.], 1993. – Кн. 5, ч. 2. – С. 234–394.

15. *Каханоўскі, Г. А.* Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г. А. Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 118 с.

16. *Каханоўскі, Г. А.* Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч / Г. А. Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 63 с.

17. *Колабава, І. Н.* Нумізматычная калекцыя Лагойскага музея Тышкевічаў / І. Н. Колабава // Другія Тышкевіцкія чытанні (г. Лагойск, 15 кастр. 2009 г.) : матэрыялы чытанняў / рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.] ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2009. – С. 39–42.

18. *Паўлава, А. Я.* Да пытання аб асабістых архівах. Дакументы роду Тышкевічаў / А. Я. Паўлава // Другія Тышкевіцкія чытанні (г. Лагойск, 15 кастр. 2009 г.) : матэрыялы чытанняў / рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.] ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2009. – С. 54–59.

19. *Смолік, А. І.* Граф Канстанцін Тышкевіч : вучоны, археолаг, краязнаўца / А. І. Смолік // Народная асвета. – 2013. – № 8. – С. 82–86.

20. *Трусаў, А. А.* Вяртанне навуковай спадчыны братоў Тышкевічаў у беларускую археалогію / А. А. Трусаў // Другія Тышкевіцкія чытанні (г. Лагойск, 15 кастр. 2009 г.) : матэрыялы чытанняў / рэдкал. : А. І. Смолік (адк. рэд. ) [і інш.] ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2009. – С. 75–80.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ